# ВЫТОКІ І РАЗВІЦЦЁ УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У КАНЦЫ XVI – ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XVII СТ.

**А. В. Саўчанка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*Esperovic@yahoo.com;*
*навук. кір. – В. А. Кахновіч, канд. гіст. навук, дац.*

У дадзеным тэксце раскрываюцца сацыяльныя, палітычныя і культурныя вытокі Берасцейскай уніі 1596 г. Таксама паказаны працэс развіцця уніяцкай царквы як неад’емнай часткі грамадскага і культурнага жыцця ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай. Доказна паказана, што уніяцкая царква была ўвасабленнем гістарычнага месца беларускага і украінскага народаў паміж Усходам і Захадам, і таму яна стала ўнікальным і арыгінальным адказам нашых продкаў на выклікі часу.

***Ключавыя словы:*** рух за унію; уніяцкая царква; Берасцейская унія 1596 г.; культурная спадчына; культурны сінтэз; рэлігія; духоўнае жыццё.

Вытокі рэлігійнай уніі на нашых землях палягалі яшчэ здаўна. Якраз сутыкненне дзвюх культур і рэлігійных традыцый (усходняга і заходняга хрысціянства) прыводзіла да свайго роду сінтэзу і пошуку нейкага кампрамісу з жаданнем яго афармлення.

Самы вядомы прыклад такой рэалізацыі – гэта 1439 г., калі была падпісана Фларэнтыйская унія. Менавіта «Ферара-Фларэнтыйскі дух» абумовіў гарманічнае развіццё праваслаўнай і каталіцкай цэркваў у ВКЛ, а антыподам гэтаму духу можна прывесці Маскоўскі «асаблівы шлях», калі маскоўскі цар Іван ІІІ адмовіўся ад уніі праз увязненне, а пасля і выгнанне мітрапаліта Ісідора.

У далейшы час узаемныя кантакты уз’яднаных цэркваў у ВКЛ перарваліся, калі не сказаць спыніліся, але фармальна адыходу, а тым больш адмовы ад Фларэнтыйскай уніі не было.

Бурлівыя падзеі 60–90-х гадоў XVI ст., сярод якіх Лівонская вайна 1557–1582 гг., якая прывяла да ўзнікнення новай дзяржавы – Рэчы Паспалітай, і рэформа касцёла (Трыдэнцкі сабор, які трываў ад 1545 да 1563 г.) з наступам на пратэстантаў, паспрыялі аднаўленню ў шэрагах праваслаўных ярархаў памкнення свайго роду рэанімавання і новай адаптацыі акту 1439 г. праз новую унію.

Штуршком і спускавым кручком стала паўстанне ў 1590 г. новага рэлігійнага цэнтру ў Маскве (5-га патрыярхату), які замахваўся ў тым ліку на душы праваслаўных вернікаў Рэчы Паспалітай. Часткова была уласная карысць рэалізацыі уніі для ярархаў (так адзін з яе ініцыятараў біскуп Львоўскі Гедэон (Балабан) праз унію вырашаў канфлікт улады з брацтвам у Львове; біскуп Луцкі і Астрожскі Кірыла (Цярлецкі) праз унію мог пазбегнуць царкоўнага суду).

Ідэя уніі выношвалася і ў свецкіх колах. Так свайго роду праект меў Васіль Канстанцін Астрожскі, але ў ім быў адзін момант, што перашкаджаў яго рэалізацыі. У біскупаў быў план мясцовай уніі, якая б ахапіла выключна Кіеўскую мітраполію, а Астрожскі жадаў прыцягнуць да перамоў усіх праваслаўных, у тым ліку Маскоўскага патрыярха, хоць сама унія, у тым ліку, была спробай супрацьстаяць спробам пасягальніцтва на «сваіх вернікаў» як раз з боку Масквы.

1593 г. у царкоўных шэрагах адбыліся змены, бо на вызваленую (па прычыне смерці папярэдняга ўладыкі) Уладзімірска-Берасцейскую кафедру прыйшоў Іпацій (да пострыгу Адам) Пацей, які меў таксама свае погляды на унію. Можна сказаць, што ў шэрагах патаемна выношваючых план уніі ярархаў прыйшоў «чалавек Астрожскага», бо некаторыя гісторыкі ўказваюць на сяброўскія стасункі (да пэўнага часу) гэтых дзвух людзей (украінскія гісторыкі пішуць пра прамое лабіраванне кандыдатуры Пацея князем Астрожскім) разам з стаяннем іх абодвух за рэформу царквы, запачаткаваную яшчэ ўсходнімі патрыярхамі, калі браць за рэформу пашырэнне правоў брацтваў для сачэння за маральнымі паводзінамі ярархаў і ўдасканалення кіраўніцтва царквою праз актыўнасць брацтваў (кнігадрукаванне, адкрыццё шпіталёў, а галоўнае падрыхтоўка святарскіх кадраў).

Уласна прыход Іпація Пацея шмат у чым ажывіў рух уніі, бо ўжо за 1594 г. прайшло афармленне шэрагу дакументаў, якія дэкларавалі памкненне заключыць унію, з адначаснай падачай прычын такога кроку. Так прычыны былі такія: рост колькасці ярархаў (патрыярхаў), якіх стала 8 (у мемарандуме Кіеўскага сабора апісана так: «съ чотырехъ осмъ учинило (чого перед тым николи не бывало ихъ так много…)» ), а ў дэкларацыі вясны 1594 г. пісалася так: «губительное умножение числа духовных властителеи».

Безумоўна, яшчэ ішлі патрабаванні зраўнання з каталікамі і захавання сваіх пасадаў і духоўных званняў і чыноў. Адным словам, размова ішла толькі пра змену падпарадкавання (замест патрыярха і ў цэлым усходніх уладык, што праязджалі нашы землі па дарозе ў Маскву, не моцна дбаючы пра стан царквы на нашых землях, на далёкага ад нашых земляў Папу Рымскага), калі за гэтым крокам уладыкі жадалі фактычна стабілізацыі становішча вярхоўнай улады царквы, калі ёсць адзіны пастыр, а па прычыне дальняга знаходжання Папы яны (згодна іх планам) мелі патэнцыял фактычна незалежна існаваць.

1595 г. стаў годам, калі ўсю дакументальную базу і дэкларацыі аб намерах былі спушчаныя для абмеркавання, як тое кажуць «на месцах» (і шэраг саборыкаў выказаліся за унію), а таксама падвядзення аргументацыі «за» справу праз выданне палемічна-схаластычнага твору

аўтарства І. Пацея «Унія грэкаў з касцёлам Рымскім» (у свой час нешта падобнае з заклікам да праваслаўных рабіў касцёл праз выданне твору Пятра Скаргі «Аб адзінстве царквы Божай» у 1577 г.). Твор паказваў пэўныя разыходжанні паміж каталікамі і праваслаўнымі, пераадоленне якіх робіць іх (прадстаўнікоў дзвюх плыняў хрысціянства) аднолькавымі. Летам 1595 г. на бок уніі ўдалося перацягнуць самага галоўнага ярарха – мітрапаліта Кіеўскага і Галіцкага усёй Русі Міхаіла (Рагозу). Прычыны могуць быць рознымі – ад карысці да злапамятнасці ад запалай абіды на ўсходняга патрыярха (калісьці праз паклёп з боку Гедэона (Балабана) патрыярх Канстантынопальскі Ярэмія ІІ для сачэння за «выпраўленнем памылак» над мітрапалітам Кіеўскім паставіў сваім экзархам біскупа Луцкага і Астрожскага Кірыла (Цярлецкага), які ў свой час кідаў разам з тым жа Балабанам заклік да уніі і адыходу ад патрыярха).

Прыцягненне на бок уніі Рагозы было свайго роду ўраўнаннем, бо, дазнаўшыся пра планы уніі ўжо на завяршаючай стадыі, князь Астрожскі быў гэтым абражаны, пасля чаго і разышоўся з біскупам Пацеем, стаўшы адным з галоўных апанентаў уніі, пачаўшы збор вакол сябе людзей.

І летам для ўмацавання ярархаў з боку ўлады (караля і вялікага князя Жыгімонта ІІІ Вазы) быў выданы прывілей ад 30.07.1595 пра зраўнанне тых праваслаўных, хто стане ў лона уніі, разам з каталікамі па ўсіх аспектах. Праз пару дзён (02.08.1595) каралём быў выдадзены дадатковы ўніверсал, у якім гаварылася, што будуць уведзеныя ў жыццё ўсе пункты артыкулаў уніі, але ў дзвух пунктах падкрэслены магчымыя абмяжаванні адносна ўдзелу уніяцкіх біскупаў у Сенаце, што са слоў караля павінна было прайсці абмеркаванне ў Сейме.

З восені 1595 г. пачынаецца новы этап, калі два абраныя ад усяго духавенства ВКЛ ўладыкі (Іпацій Пацей і Кірыла Цярлецкі) накіраваліся ў Рым. Пры тым для гісторыкаў дасюль застаецца нераскрытым перыяд перабывання ў Рыме гэтых асобаў, бо невядома чым займаліся ярархі на працягу месяца пасля сваго прыезду ў лістападзе і аддачы ўсіх дакументаў (дэкларацый і як бы самога плану уніі) у Грэцкую калегію па справам веры. Самы вядомы момант – гэта ўласна аудыенцыя ў Папы, дзе былі падпісаны дэкларацыя і акт аб уніі. Адметны момант, які адзначалі, у тым ліку, у пратаколе аўдыенцыі, – гэта зварот уладык асабіста да пантыфіка перад самім актам падпісання уніі, дзе асноўным было прашэнне захаваць усходняе нутро сваёй царквы (абрады) некранутым і без зменаў.

З вясны (сакавіка) па восень (кастрычнік) 1596 г. – перыяд праходжання ўсіх цяжараў пры падрыхтоўцы да сабору ў Берасці, які і

абвесціў унію. Аб’яднаўчай ролі царкоўнай уніі пакуль не бачна, бо прыхільнікамі уніі былі вярхі царквы (акрамя некаторых, якіх пераманіў на свой бок Астрожскі, а гэта біскупы – Гедэон (Балабан) і Захрыя Капысценскі), а сярод апанентаў – нізы, гатовыя да актыўнага выступу (так яшчэ ў 1595 г. адбылося вядомае паўстанне Севярына Налівайкі, дзе сярод прычынаў палягала і рэлігійная).

Асноўныя крокі па распаўсюджванню і замацаванню уніі прыходзяцца на пачатак XVII ст. і звязаны з дзейнасцю мітрапалітаў Кіеўскіх Іпація Пацея (1600–1613 гг.) і Язэпа Вельяміна Руцкага (1613–1637 гг.). Гэтым ярархам прыходзілася рэагаваць на розныя выклікі, што выпалі на унію.

Так І. Пацей спрабаваў закласці ў свядомасць сваёй паствы разуменне, што унія ўласна ставала як бы пераймальніцай і працягвальніцай праваслаўнай царквы ВКЛ. Пры ім цэнтрам уніяцкай царквы стала Сафія ў стольным Кіеве (пад уніятамі храм быў ад 1600 да 1633 г.). На яго, як мітрапаліта, клалася апекаванне малымі асяродкамі уніі ў Вільні (Свята-Троіцкая царква была адзіная на фоне 10 праваслаўных храмаў, з якіх адна Свята-Духава разам са сваім брацтвам знаходзілася ў жорсткай канфрантацыі з уніятамі) разам са школай і яе навучэнацамі. Уласна пад Пацеевым «крылом» духоўна ўзраслі два вядомыя ўладыкі: Язэп (да пострыгу Іван) Руцкі, які прыйшоў на месца выкладчыка багаслоўя і моў (царкоўнаславянскай і лацінскай), стаўшы ўжо пры жыцці Іпація Пацея яго пераемнікам, а таксама Ясафат (да пострыгу Іван) Кунцэвіч, які падняўся па ярархічнай лесвіцы ад протапрасвітэра і дыякана спачатку да архімандрыта трох манастыроў (Быценскага, Жыровіцкага і Свята-Троіцкага), дасягнуўшы пасады арцыбіскупа Віцебскага і Полацкага.

Пацей задаў свайго роду «трэнд» на цэлую кампанію «барацьбы за маёмасць» і душы – манастыры і храмы разам з вернікамі. Так згодна з граматай ад 19.01.1602 архімандрыт Супрасльскага манастыра выганяўся за межы дзяржавы за супраціў Кіеўскаму мітрапаліту. Цікава, што толькі архімандрыт, а значыцца насельнікаў-манахаў манастыру ўсё задавольвала. Таксама не напісана, што манастыр пераводзіцца ў лона уніі, значыцца ён ужо знаходзіўся ў ёй пэўны час. Далейшы працяг «бітвы за маёмасць» – грамата ад 03.03.1605, якая сведчыла пра перадачу яму (І. Пацею) ў кіраўніцтва Ляшчынскага Мікалаеўскага мужскога манастыра з людзьмі, даходамі і надзеламі. Па зместу граматы стае зразумелым, што размова вядзецца пра перадачу, а не перавядзенне да уніі, што значыць і гэты манастыр таксама ўжо быў у ёй уласна да перавядзення пад кіраўніцтва мітрапаліта Кіеўскага.

Самым паспяховым момантам пры жыцці Пацея можна лічыць далучэнне да уніі Узнясенскага манастыра ў Менску, які згодна з каралеўскай граматай ад 30.03.1613, аддаваўся уніятам на «вечныя часы».

Тым не менш уніяцкая царква вагалася і знутры. Выпадак 1608 г. з адмовай ярархаў Самуіла Сенчылы і Барталамея Рашкоўскага падпарадкоўвацца новаму архімандрыту і намесніку мітрапаліта ў Троіцкай абіцелі (маецца на ўвазе Язэпу Руцкаму). Спроба прыцягнуць справу да духоўнага суду прывяла да пазбаўлення Самуіла Сянчылы сану, пасля чаго ён і большасць манахаў запісаліся ў Свята-Духава праваслаўнае брацтва пры аднайменнай царквы. Сенчыла, стаўшы пасля запісу праваслаўным, спрабаваў пазней захапіць абіцель, але ім перашкодзіў Ясафат Кунцэвіч з маладымі манахамі, якія засталіся ў абіцелі пасля сыходу Сенчылы і яго прыхільнікаў. Справа дайшла да суда, а пасля і да караля, які згодна яго ўказу ад 20.02.1609 прадпісваў скласці рэестр маёмасці і скарбу уніяцкага Свята-Троіцкага манастыру, а калі чаго не стае, вярнуць мітрапаліту любым коштам, а бажніцы і ўсё перапісаць якраз на уніятаў (аднак праваслаўнае брацтва ізноў заявіла пра сябе праз месяц пасля ўказу зноў жа спробай захопу манастыру, на што уніяты падалі скаргу ў віленскі магістрат).

1608 г. прывёў да страты ў шэрагу праваслаўных свайго роду моцнага аўтарытэту, прадстаўленага асобай князя Астрожскага. Паступова будзе бачна як абаронцамі сапраўднай (ёсць часам назвы як «грэцкай», «усходняй» альбо «рускай») веры будуць ставаць казакі. Так, менавіта казак Іван Тупека рабіў замах на Пацея (у выніку мітрапаліт страціў тры пальцы), менавіта казакі стануць яднацца вакол братцваў і з асяродку браць сабе святароў. І накал запалаў быў яшчэ наперадзе.

Пераняўшы баразды кіравання уніяцкай царквою, Язэп Руцкі пачаў новае рэфармаванне царквы. Так ім яшчэ ў манастыру ў Вільні выношваўся план стварэння моцнага, яднаючага для уніі, яе ўласнага ордэну. Ордэн павінен быў стаць свайго роду сумяшчэннем традыцый ўсходняга чарнецтва (праз апору на закон Васіля Вялікага) з практыкаю манаства на захадзе, у выніку чаго паўстаў ордэн базыльянаў (альбо васільянаў, бо базыяльяне больш лацінізаваная версія). Нельга сказаць, што ордэн паўстаў у 1617 г. Яго арганізацыя і станаўленне праходзіла праз шэраг кангрэгацый ад 1617 да 1631 г. Пры тым адметнасцю было тое, што Руцкі неаднаразова настойваў і фіксаваў на кангрэгацыях абавязак стаяць на ўсходнасці царквы ў яе традыцыях і абрадах. Сам мітрапаліт Руцкі, апелюючы і акцэнтуючы на аснове ордэну – «Правілах Васіля Вялікага», паказваў, што ён не змяняе ўсходняй традыцыі, а наадварот развівае яе, дадаючы тое, чаго ёй не хапае для гэтага часу.

Таксама ён пісаў на імя Папы лісты, каб уніятаў не пераводзілі ў вышэйшы, значыцца Рымскі, абрад.

Менавіта на час кіравання царквою Язэпам Руцкім прыпалі самыя цяжкія іспыты і выпады ў бок царквы. Спачатку ў 1618 г. яго намеснік у Кіеве будзе забіты, а казакамі будуць схоплены некалькі базыяльян, якіх прыцягнулі у Цехцяміраў, трымалі ў яме, пакуль на казакаў не націснула ўлада (пры тым вінаватых за гэтыя выпады не пакаралі).

Эпапеяй і моцным накалам сутыкнення інтарэсаў уніятаў з казакамі стаў момант, калі праз дзейнасць гетмана Пятра Сагайдачнага ў 1620 г. патаемна быў дастаўлены Ерусалімскі патрыярх Феафіл, які высвяціў новую праваслаўную ярархію, дзе яго высвячэнцы былі прызначаны на кафедры, ужо занятыя уніятамі.

Супрацьстаянне неаднаразова выносілася на Сеймавыя пляцоўкі спробай апеляваць да таго, каб улада вызнала высвячэнцаў Феафіла, але ж, не атрымаўшы гэтага са смерцю гетмана Сагайдачнага ў 1622 г., казакі пайшлі па канфрантацыйнаму шляху.

Самы вядомая кульмінацыя сутыкнення – забойства жыхарамі Віцебска арцыбіскупа Ясафата Кунцэвіча. Сама падзея 1623 г. выглядае не іначай як правакацыя, бо яшчэ пры жыцці Кунцэвіча на яго вотчыне (усходзе Беларусі) мелі месца засыланне агентаў Мялеція Сматрыцкага, якія падштрухоўвалі да супраціву (першы выпадак Магілёўскі інцыдэнт 1619 г., а ад моманту высвячэння М. Сматрыцкага ў сан арцыбіскупа ў 1620 г. узяў верх накірунак на абвастрэнне, што вылілася ў сутыкненне).

Эфект ад падзеі 1623 г. нанёс урон толькі праваслаўным. Царква была пастаўлена на мяжу забароны як тая, што апякуецца бунтаўшчыкамі. Сама трагедыя прывяла да ўцёкаў Смартыцкага, які пазней паехаў на ўсход дзеля азнаямлення са станам «царквы-маці». Якраз наведванне ўсходу прывяла уладыку Мялеція да яго разумення крызісу на ўсходзе, напісанню працы «Апалогія» і ставання ў адзін шэраг з уніятамі. Ён сышоўся з мітрапалітам Язэпам Руцкім у разуменні з’яднаць вернікаў, а таксама яны абодва стаялі ля вытокаў ідэі фармавання новага рэлігійнага цэнтру (свайго роду Літоўскага патрыярхату), які не мог быць рэалізаваны ад самага пачатку.

Добрыя намеры павінны былі быць рэалізаваны праз правядзенне аб’яднаўчых сабораў. Такі сабор рыхтаваўся ў Кіеве на дзень Заснення (ці іначай Успення) Багародзіцы ў Кіеве, але казацкі фактар абумовіў зрыў павесткі сабору, адыход ад Смартыцкага прыхільнікаў, сярод якіх быў архімандрыт Пячорскага манастыра Пётр (Магіла), а самога ўладыку Мялеція прымусілі адмовіцца ад тэзісаў у яго «Апалогіі» з яе патаптаннем. Наступны год была ізноў спроба сабору, але праз няяўку праваслаўнага боку, да якога ён быў звернуты, сабор быў прызаназы

правальным. Сматрыцкі адышоў ад спраў, абраўшы чарняцтва і памёр у 1633 г. Сам мітрапаліт Язэп (Руцкі) памёр у 1637 г.

Але нельга сказаць пра правальнасць ідэі уніі. У 1632 г. на Элекцыйным Сейме праявіў сябе актыўным архімандрыт Пётр Магіла (у свой час прыхільнік М. Сматрыцкага), які паспрыяў аднаўленню праваслаўнай ярархіі і падпісанню артыкулаў «Заспакаення веры грэцкай». Заняўшы пасаду мітрапаліта ў 1633 г. (са згоды ўлады і высвячэння людзьмі патрыярха Канстантынопальскага), ён зняў з пасады Ісаю Капынскага за занадта прамаскоўскую арыентацыю, прыйшоўшы з дапамогай казакаў, хоць пазней сам пачаў ад тых жа казакаў дыстанцыянавацца з-за радыкальных настрояў апошніх (так падчас выступу Паўла Бута 1637–1638 гг. Магіла стаяў на пазіцыі ўладаў адносна сродкаў задушэння).

Падпісанне артыкулаў «Заспакаення», аднаўленне ярархіі праваслаўных і запусціла працэс падзелу паміж уніятамі і праваслаўнымі, калі адбываўся падзел маёмасці і вызначэнне «кананічнай тэрыторыі» для кожнай з плыняў (так за уніяцкай мітраполіяй пакінулі Уладзімірскую, Холмскую, а таксама Полацкую, Пінскую і Смаленскую дыяцэзіі; праваслаўным жа адводзілі Львоўскую, Луцкую; агульнымі як для уніятаў, так і праваслаўных заставаліся Кіеўская і Перамышльская дыяцэзіі).

Тым не менш унія шмат чым узбагаціла погляды праваслаўных. Уплыў уніі на праваслаўных правіўся ў кроках мітрапаліта Кіеўскага, калі той зразумеў патрэбу ўзвышання прэстыжу праваслаўя, якое праз доўгі час барацьбы з уніятамі было ўжо не было прыцягальным па прычыне «цёмнасці» і «замшэласці». Так, пасля прапісання правоў друкарняў і школаў мітрапаліт Магіла заняўся адукацыяй.

Першым крокам у гэтым накірунку стала заснаванне, а фактычна стварэнне Кіева-Магілянскай школы (з 1702 г. атрымала статус акадэміяй, што стала сапраўднай «кузняй кадраў» для зямель Украіны, Беларусі, а пасля далучэння Кіева і Расіі). Фактычна Магіла правёў гнуткае і асцярожнае рэфармаванне арганізацыйна-кадравай структуры праваслаўнай сістэмы адукацыі і выхавання, беручы, не цураючыся, ўсё лепшае ад канкурэнтаў (лаціннікаў), напрыклад, зноў жа заходнія лацінскія школы, ўводзячы як мову навучання лацінскую з вывучэннем схаластыкі праз творы Фамы Аквінскага (шанаванага якраз у каталіцкім асяродку). Усе гэтыя захады па «маламу ўкрапленню» заходніх элементаў ўзбагачалі царкву, а таксама рабілі далягляд яе сяброў больш шырокім. Як мітрапаліт уніяцкі Язэп (Руцкі) і Магіла надаваў шмат увагі жыццю манахаў-чарняцоў, якія з-за неўмяшальніцтва ў іх справы з боку ярархаў вялі бестурботнае жыццё. Асобу Пятра Магілы становіча

адзначаў Папа Урбан VIII у 1643 г., нават у лісце менаваў яго «братам», а яго асоба стала надзеяй на аб'яднанне раздражнёных лагераў адной «грэцкай веры».

Пётр Магіла працягнуў трохі ўзнаўлёную ідэю новага цэнтру патрыярхіі, якім павінен быў стаць Кіеў, а сам бачыў сабе новым патрыярхам, аднак кансэрватыўны погляд праваслаўных украінскіх сіл і рэаліі самой дзяржавы, якія наўрад бы дазволілі стаць «новаму Рыму», абрынулі гэтыя планы.

Цікава таксама адзначыць, што Ніканаўскую рэформу па набліжэнні літургіі маскоўскай да грэцкай праводзілі так званыя «кіеўскія старцы», звязаныя з Магілянскай школай (Епіфаній Славінецкі, грэк Арсеній і пэўным чынам Сімяон Полацкі). Якраз гэтых рэфарматараў протапоп Авакум менаваў не іначай як «уніятамі і прыхваснямі рымскімі», а самога патрыярха Нікана праз пераемнасць рэформ Пятра Магілы вінілі ў насаджванні на «чыстае праваслаўе» якраз уніі, што на погляд кансерватараў (як Авакум і інш. «ревнители») выглядала «увядзеннем у лацінства». Пры апісанні жыцця Магілы ў дарэвалюцыйнай Расіі ў XIX ст. заўсёды акцэнтавался на яго прыналежнасці да праваслаўя, але былі і прыклады абвінавачання яго ў падпаданні пад лацінізм са стварэннем своеасаблівага феномену пад назвай «магілянства».

У цэлым 15 год (1632–1647 гг.) можна лічыць часам спакою і адносна мірнага суіснавання уніі і праваслаўя перад гразою, якая выбухнула ў 1648 г.

Падводзячы вынікі можна сказаць, што унія сапраўды была характэрна для ВКЛ праз прыстунасць дзвюх культур і плыняў хрысцінства, а са з'яднаннем у адну дзяржаву Рэч Паспаітую выглядала цалкам лагічным крокам.

Сам акт уніі 1596 г. у поглядах яе стваральнікаў і інцыятараў разглядаўся проста зменай юрысдыкцыі для свайго роду стабілізацыі і арыентацыі на аднаго вярхоўнага іерарха ў асобе Папы Рымскага, якому адводзілася толькі дабраслаўляць і высвячаць мітрапаліта, але ярархі не думалі пра далейшую трансфармацыю унію і патрэбу адстойваць яе, бо лічылі, што спрацуе схема: «куды пастыры, туды і іх оўцы».

Унія вымушана была супрацьстаяць пасяганням на сябе, змагаючыся за сваё інаванне, а таксама за маёмасць і вернікаў, што бачна праз лінію дзей мітрапаліта Кіеўскага Іпація Пацея. Дзеі ж мітрапаліта Язэпа Руцкага палагалі ў далейшым канструяванні вертыкалі уніі праз стрыжань, прадстаўлены ордэнам базыльянаў і лініяй на рабленне уніі прэстыжнай праз падвядзенне адукацыі ў ордэне на адзін узровень з каталіцкай, але трыманнем за ўсходнія абрады і дактырыны.

Унія мела вялікі патэнцыял, таму супраць яе паўставалі розныя групоўкі, якія мелі значных кансалідуючых асоб (спачатку князя Астрожскага, пасля гетмана Сагайдачнага), аднак са смерцю кансалідуючай асобы рух супраць уніі ставаў народным, будучы прадстаўлены ці мяшчанамі (як у выпадку забойства Ясафата Кунцэвіча) ці брацтвамі ў злучэнні з казакамі, дзе казакі ставалі моцным фактарам раздражнення грамадства, настойваючы выключна на сваім стаянні за «сапраўдную веру». Дзеі Пятра Магілы, як уплывовага дзеяча і зноў як кансалідуючай асобы, абумовілі ўзбагачэнне праваслаўя, даўшы 15 год адноснага спакою для уніі.